МІКАЛАЙ КУЗЬМІНІЧ
Беларускі універсітэт культуры

# МЭТА ЯК СІСТЭМАЎТВАРАЮЧЫ ЭЛЕМЕНТ ЦЭЛАСНАГА НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ

Вучэбна-выхаваўчы працэс у ВНУ як цэласнае ўтварэнне мае свае ўнутраныя і вонкавыя сувязі і адпаведныя ім заканамернасці функцыяніравання педагагічнай сістэмы. З аднога боку, гэта абумоуленасць навучальнага працэсу патрэбнасцямі грамадства, сацыяльнымі ўмовамі, аб'емам і характарам назапашанай інфармацыі, узаемасувязь працэсаў адукацыі, выхавання і развіцця асобы, залежнасць працэсу навучання ад матэрыяльна-тэхнічных, прасторава-часавых, маральна-псіхалагічных і іншых умоў, ад магчымасцей навучэнцаў.

З другога боку, гэта сувязь паміж дзейнасцю выкладчыкаў і дзейнасцю студэнтаў, абумоўленасць вучэбна-выхаваўчых задач грамадскімі патрэбнасцямі і рэальнымі магчымасцямі выкладчыкаў і студэнтаў, залежнасць зместу навучальнага працэсу ад яго задач, метадаў і сродкаў — ад задач і зместу, форм арганізацыі — ад задач, зместу і метадаў; залежнасць поспеху у дасягненні мэт — ад узаемасувязі ўсіх кампанентаў тэхналагічнай падсістэмы, яе цэласнасці.

З заканамерных сувязей навучальнага працэсу вынікае важнае метадалагічнае патрабаванне аб неабходнасці суаднясення, з аднаго боку, мэт з магчымасцямі тэхналогіі, а з другога — аб неабходнасці пабудовы элементаў тэхналогіі у такую цэласную сістэму, інтэгратыўнай якасцю якой было б адзінае функцыянальнае прызначэнне ўсіх элементаў, іх скіраванасць на канчатковыя вынікі, інакш кажучы, арганізацыя навучальнага працэсу (як вучыць) і яго змест (чаму вучыць) цалкам залежаць ад адказу на пытанне, якое з'яуляецца зыходным пунктам пабудовы педагагічнай сістэмы: для чаго вучыць (мэты навучання).

Сучасная практыка навучання студэнтаў у ВНУ культуры не мае навукова абгрунтаванага адказу на пытанне аб мэтах. У іх якасці выступаюць сфармуляваныя ва ўрадавых (раней — у партыйных) дакументах патрабаванні да выпускнікоў ВНУ культуры. У іншых выпадках мэты падмяняюць зместам навучання, характарыстыкамі дзейнасці выкладчыка. Зразумела, такія мэты нельга выкарыстоўваць для параўнання з рэальнымі вынікамі функцыяніравання педагагічнай сістэмы ВНУ.

У аснове выразнэння педагагічных мэт ляжыць філасофскае вызначэнне катэгорыі «мэта»: прадбачанне ва ўсведамленні выніку, на дасягненне якога скіраваны дзеянні. Пастаноўка мэты азначае улік сродкаў і спосабаў іх выкарыстання.

На шляху ад мэты да выніку сродкі з'яўляюцца цэнтральным звяном дзейнасці чалавека. Яны выступаюць як адзінства рэчавых кампанентаў, сукупнасці аб'ектыўных фактараў і відаў дзейнасці, якія вядуць да мэты. Такім чынам, мэта і сродкі ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены адно адным.

Сярод асноўных прынцыпаў эфектыўнага функцыяніравання сістэм, у тым ліку і педагагічных, даследчыкі вылучаюць наступныя: а) цэласнасць сістэмы, г. зн. высокую ступень ўзаемасувязі ўсіх яе кампанентаў; б) умацаванне цэласнасці сістэмы, г. зн. пастаяннае ўмацаванне трываласці сувязяў паміж яе кампанентамі; в) сумяшчальнасць сістэмы з умовамі яе функцыяніравання; г) аптымізацыя сістэмы — забеспячэнне высокай ступені адпаведнасці кампанентаў сістэмы тым мэтам, дзеля якіх яна створана. Зыходзячы з гэтага, натуральнай выглядае спроба пераносу агульных прынцыпаў эфектыўнага функцыяніравання сістэмы на працэс навучання. Такімі прынцыпамі эфектыўнага функцыяніравання сістэмы навучання у ВНУ з'яуляюцца: 1) арыентацыя на канчатковыя мэты падрыхтоўкі спецыяліста; 2) пабудова працэсу навучання як мэтавай праграмы; 3) адпаведнасць сістэмы патрабаваням сацыяльнаэканамічнага развіцця грамадства і сучасным псіхолага-педагагічным канцэпцыям. Пры гэтым першы і другі прынцыпы суадносяцца як мэта і сродак яе рэалізацыі і адлюстроўваюць агульныя (першы, другі і чацвёрты) прынцыпы, а трэці прынцып

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

функцыяніравання педагагічнай сістэмы суадносіцца з трэцім агульным прынцыпам.

Многімі даследчыкамі справядліва прапануецца будаваць навучальны працэс на аснове спецыяльна арганізаванай дзейнасці студэнтаў, якая паступова павінна развіцца як дзейнасць спецыяліста. Інакш кажучы, засваенне ведаў адбываецца ў працэсе іх выкарыстання. Значыць, мэты павінны адлюстроўваць прафесійную дзейнасць і фармулявацца у тэрмінах відаў прафесійнай дзейнасці. Адпаведна крытэрыем ведаў выступае уменне іх выкарыстоўваць у сваей прафесійнай дзейнасці. Адсюль вынікае неабходнасць дакладнага апісання відаў дзейнасці спецыяліста, якімі студэнты павінны авалодаць у ВНУ, пераходу ад выніковых комплексных мэт да мэт вывучэння асобных вучэбных дысцыплін. Складанасць такога пераходу заключаецца у тым, што адны прадметы з выніковымі мэтамі звязаны апасродкавана, праз іншыя дысцыпліны, а шэраг прадметаў мае непасрэдны выхад на выніковыя мэты. Гаворка ідзе пра неабходнасць распрацоўкі сістэмы, прадстаўленай у выглядзе іерархіі агульных і прыватных мэт асобных вучэбных дысцыплін, раздзелаў, тэм.

Такім чынам, асноўная мэта ВНУ заключаецца у агульнай і прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў у адпаведнасці з сацыяльным заказам. Прафесійная дзейнасць вызначае мэты вывучэння дысцыплін, а значыць, змест і формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці.

У апошнія гады праблема навуковай арганізацыі навучальнага працэсу у педагагічнай літаратуры звязваецца з канкрэтызацыяй мэт, мадэліраваннем профіляў спецыялістаў. Актыўна распрацоўваюцца кваліфікацыйныя характарыстыкі спецыяльнасцей, дзе указаны неабходныя спецыялісту дадзенага профілю веды і уменні. Разам з тым справядліва указваецца на цяжкасці пры выкарыстанні кваліфікацыйных характарыстык у якасці канкрэтных мэт навучання. Сур'ёзныя заўвагі выказваліся і па кваліфікацыйнай характарыстыцы па спецыяльнасці «культурна-асветная работа», якая пры арганізацыі навучальнага працэсу практычна не выкарыстоўвалася.

Аналіз праграм вучэбных дысцыплін мастацкіх спецыялізацый інстытутаў культуры таксама сведчыць аб бессістэмным драбленні агульных мэт, адсутнасці адзіных прынцыпаў такога драблення, калі за пералікам асобных ведаў, уменняў і навыкаў спецыяліста губляецца сувязь з канкрэтнымі відамі яго прафесійнай дзейнасці, слаба рэалізуецца прынцып пераемнасці паміж мэтамі і задачамі асобных кафедраў і вучэбных дысцыплін, калі недакладна вызначаны месца і роля кожнай кафедры і дысцыпліны ў агульнай структуры вучэбных прадметаў.

Рашэнне праблемы мэт у педагагічнай літаратуры справядліва звязваецца з распрацоўкай мадэлі спецыяліста таго ці іншага профілю, якая ўяўляе сабой сукупнасць патрабаванняў, прад'яўляемых практыкай да выпускніка ВНУ, і якія пэўным чынам рэалізуюцца у навучальным працэсе. Пры гэтым мадэль спецыяліста можа быць прадстаўлена або як сістэма патрабаванняў да ведаў, уменняў і асабістых якасцей спецыяліста, або як апісанне яго дзейнасці, выконваемых ім функцый і неабходных для гэтага асобасных якасцей.

У галіне культурна-асветнай работы некаторыя даследчыкі рабілі спробы вызначыць неабходныя спецыялісту веды, уменні, навыкі і яго асобасныя якасці, абапіраючыся пры гэтым на больш ці менш глыбокі аналіз прафесійнай дзейнасці культасветработніка.

Больш перспектыўнымі ўяўляюцца спробы пабудовы мадэлі спецыяліста на аснове апісання яго дзейнасці. Такая мадэль складаецца з мадэлі дзейнасці спецыяліста, зарыентаванай на вывучэнне і апісанне сферы дзейнасці выпускнікоў дадзенага профілю, умоў іх працы і неабходных ім ведаў, уменняў і навыкаў, якасцей асобы і мадэлі падрыхтоўкі, якая ўключае вучэбныя планы і праграмы, формы сувязі з вытворчасцю, выхаваўчыя мерапрыемствы і іншыя элементы тэхналогіі навучальнага працэсу. Такі падыход да распрацоўкі мэт падрыхтоўкі спецыялістаў дазволіў бы рэалізаваць прынцып сувязі навучання з жыццём, пераадолець ўласцівыя кваліфікацыйнай характарыстыцы недахопы, якія выражаюцца ў тым, што мэты там прадстаўлены пералікам ведаў і уменняў без пэўнай сувязі з тымі рэальнымі жыццевымі задачамі, якія выпускнік будзе вырашаць у будучым. Таму пералік ведаў і уменняў трэба дапоўніць пералікам тыповых задач, што раскрываюць сутнасць дзейнасці спецыяліста. Гэта тым больш неабходна, бо веды рэалізуюцца у тых ці іншых умениях і відах дзейнасці. Адпаведна пра наяўнасць ведаў будзе сведчыць ўмение

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоуваць іх для вырашэння пэўных прафесійных задач.

Такім чынам, пры канкрэтызацыі агульных мэт навучальнага працэсу у дачыненні да спецыялізацыі, кафедры, асобнай дысцыпліны і урока неабходна акрамя засвоеных пэўных ведаў указваць і тыя віды прафесійнай дзейнасці, дзе гэтыя веды рэалізуюцца. Акрамя таго, засваенне ведаў трэба арганізоўваць як працэс іх выкарыстання пры рашэнні тыловых задач: умение вучыцца, падрыхтаванасць да калектыўнай дзейнасці, умение кіраваць калектывам, высокая маральныя якасці і іншыя патрабаванні да агульнай культуры спецыяліста; задач, якія прадыктаваны патрабаваннямі прафесіі, спецыяльнасці. Тыповыя задачы групуюцца ў адпаведнасці з абагульненымі відамі дзейнасці спецыяліста, а тыя у сваю чаргу з'яўляюцца часткамі мадэлі спецыяліста.

Суадносіны тэхналогіі навучальнага працэсу з мадэллю спецыяліста можна прадставіць як суадносіны сродку і мэты. Таму арыентацыя на выніковыя мэты пры удасканаленні навучальнага працэсу становіцца важнай умовай павышэння цэласнасці тэхналагічнай падсістэмы і яе элементаў. Як мэта і змест навучальнага працэсу абумоўліваюць выбар сродкаў, так і мадэль спецыяліста, што выступае у якасці мэты педагагічнай дзейнасці, абумоўлівае пэўны набор элементаў тэхналогіі, неабходны узровень іх развіцця і ўзаемазалежнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ